Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя У. І. ЛЕНІНА

№ 12 (511) Субота, 6 красавіка 1963 г. Цана 1 кап. Год выдання XVI-ы

**У МІНСКУ ЗАКОНЧЫЛА СВАЮ РАБОТУ ПЕРШАЯ СЕСІЯ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БЕЛАРУСКАЙ ССР ШОСТАГА СКЛІКАННЯ. СЕСІЯ АБМЕРКАВАЛА ПЫТАННЕ АБ ПАЛЯПШЭННІ БЫТАВОГА АБСЛУГОЎВАННЯ НАСЕЛЬНІЦТВА РЭСПУБЛІКІ, ВЫБРАЛА ПРЭЗІДЫУМ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР І УТВАРЫЛА УРАД БЕЛАРУСКАЙ ССР — САВЕТ МІНІСТРАЎ БССР.**

## ГРАФІК

### размеркавання маладых спецыялістаў

*(З загаду рэктара Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна)*

9 красавіка — юрыдычны факультэт.
10 красавіка — аддзяленне беларускай мовы і літаратуры.
11 красавіка — аддзяленне рускай мовы і літаратуры.
12 красавіка — гістарычны факультэт.
13 красавіка — геаграфічны факультэт.
15 красавіка — фізічны факультэт.
16 красавіка — матэматычны факультэт.
17 красавіка — хімічны факультэт.
18 красавіка — біялагічны факультэт.
19 красавіка — аддзяленне журналістыкі.

## Вечары сустрэчы выпускнікоў

У мінулыя суботу і нядзелю адбыліся традыцыйныя вечары сустрэчы выпускнікоў універсітэта з цяперашнімі студэнтамі на пяці факультэтах: філалагічным, гістарычным, фізічным, хімічным, геаграфічным. Выпускнікі дзяліліся вопытам сваёй работы, расказвалі сённяшняму пакаленню студэнтаў аб лепшых традыцыях у тых калектывах, дзе яны працуюць, заклікалі ўпарта і настойліва авалодваць ведамі.

Сустрэчы з літаратарамі

## Размова аб маладой беларускай паэзіі

Днямі беларускі паэт, выпускнік нашага універсітэта, выкладчык беларускай літаратуры дацэнт Алег Антонавіч Лойка сустрэўся з чытачамі і бібліятэкарамі БДУ.

У змястоўнай і цікавай гутарцы Алег Антановіч пазнаёміў прысутных з творчасцю маладых беларускіх паэтаў Н. Гілевіча, Р. Барадуліна, У. Нядзвецкага, Г. Бураўкіна, К. Цвіркі, Ю. Свіркі, У. Ляпёшкіна, У. Караткевіча і іншых. Расказваючы аб творчасці маладых паэтаў, А. А. Лойка асабліва вызначыў зборнікі вершаў Н. Гілевіча «Песня ў дарогу», Г. Бураўкіна «Майская просень», К. Цвіркі «Такія сэрцы ў нас», У. Караткевіча «Вячэрнія ветразі», Р. Барадуліна «Рунець, красавацъ, налівацца».

— Вельмі радасна адзначыць,— гаворыць Алег Антонавіч, — што беларуская паэзія за апошні час атрымала добрае папаўненне. Маладая беларуская паэзія ідзе па правільнаму шляху. Яна праўдзіва раскрывае вобраз сучасніка — маладога будаўніка камунізма, дапамагае мільёнам савецкіх юнакоў і дзяўчат глыбей асэнсаваць свой час, шырэй і ясней убачыць жыццё свайго пакалення, зразумець самога сябе. Маладая беларуская паэзія гаворыць у поўны голас.

Затым А. А. Лойка спыніўся на творчасці нашых паэтэс Д. Бічэль, Е. Лось, В. Вярба, творы якіх station станоўча ацэнены грамадскасцю і крытыкай, а некаторыя з твораў увайшлі ў Анталогію беларускай паэзіі, палюбіліся нашаму чытачу.

У заключэнне сустрэчы Алег Антонавіч Лойка прачытаў свае новыя вершы.

## Навінкі гістарычнага музея

Гісторыкаў, якія спяшаюцца на лекцыі, заўсёды сустракаў «бацька гісторыі» Герадот, бюст якога даўно знайшоў супакой на пятым паверсе галоўнага корпуса. Нядаўна тут заняў сваё месца сам заступнік мастацтва і святла, паэзіі і музыкі Апалон Бельведэрскі. Між іншым, ізабражэнне Апалона прайшло своеасаблівы гістарычны шлях ад барана, захоўніка статкаў, да эталона мужчынскай прыгажосці і элегантнасці, бажаства прыгажосці і мастацтва.

Скульптуру Апалона на ўсім шляху ад скульптурна-мастацкага цэха маскоўскіх майстэрань да антычнага аддзела гістарычнага музея БДУ суправаджалі блізкія яму Афрадзіта Капуанская, амур, анатам, сатыр з флейтай, танцаўшчыца, багі Озірыс і Пта, скаваны раб. Адначасова з імі прызямліліся першыя «касманаўты» Дзедал і Ікар. Той самы Ікар з легенды, які на крылах, спаяных воскам, вырваўся з цямніцы, узляцеў у неба, да сонца. Той самы Ікар, чым імем грэкі назвалі мора, чыё імя клікала чалавека ў неба, да сонца, да зорак.

# Універсітэт за тыдзень

## З КАСМІЧНАГА ПЛАНШЭТА

Сярэдняя адлегласць ад Зямлі да Месяца — 384.400 кіламетраў, або 60 зямных радыусаў. Пры руху Месяца па элептычнай арбіце гэта адлегласць змяняецца ад 354 тысяч да 406 тысяч кіламетраў.

Аб'ём Месяца ў 50 разоў, а яго маса ў 81 раз менш зямной. Сярэдняя шчыльнасць месячнага шара складае 3,3 грама на кубічны сантыметр, гэта значыць у паўтара раза ніжэй сярэдняй шчыльнасці Зямлі.

Перыяд вярчэння Месяца вакол сваёй восі—$27^1/_3$ сутак. За гэты ж час ён робіць і адзін абарот вакол Зямлі. Таму да нас звернута заўсёды толькі адна палавіна месячнага шара.

Дыяметр Месяца — 3.476 кіламетраў. Гэта ў чатыры разы менш папярэчніка нашай планеты. Плошча Месяца ў 14 разоў менш Зямлі.

На Месяцы няма ні атмасферы, ні вады. Назвы месячных утварэнняў «моры» і «акіяны» умоўныя. Яны адлюстроўваюць узровень навукі XVII веку, калі вучоныя ўпершыню пачалі назіраць Месяц у тэлескоп, але не ведалі яшчэ прыроды яго паверхні.

Вымпел з ізабражэннем дзяржаўнага герба СССР, дастаўлены на Месяц другой савецкай касмічнай ракетай 14 верасня 1959 года, знаходзіцца ў раёне мора Дажджоў (на бачным Зямлі баку Месяца).

## Вас запрашаюць:

### БІБЛІЯТЭКА

У навуковай чытальнай зале па аўторках з 11 да 20 гадзін арганізаваны **Дзень адкрытага прагляду літаратуры**, якая паступіла ў бібліятэку за тыдзень. Бібліятэка запрашае чытачоў удзельнічаць у Днях адкрытага прагляду.

### ДРАМАТЫЧНЫ КАЛЕКТЫЎ

Заўтра, у 20 гадзін, у актавай зале корпуса па вул. Чырвонаармейскай, 6, адбудзецца спектакль **«Злодзей у раі»** Эдуарда дэ Філіпа ў пастаноўцы драматычнага калектыву універсітэта.

### БЕЛДЗЯРЖФІЛАРМОНІЯ

У актавай зале БДУ 14 красавіка адбудзецца канцэрт лаўрэата міжнародных конкурсаў **Валянціна Фейгіна**. У праграме—творы Баха, Брамса, Онегера, Стравінскага.

## У нас у гасцях— Д. Гранін

У аўторак 2 красавіка, Мінская студыя тэлебачання і бібліятэка універсітэта арганізавалі тэлеперадачу дыспута па кнізе Д. Граніна «Іду на навальніцу». На дыспуце прысутнічаў аўтар кнігі Даніііл Аляксандравіч Гранін. Паміж студэнтамі розных факультэтаў, якія прысутнічалі на дыспуце, адбылася цікавая дзелавая размова аб станоўчых і адмоўных баках рамана. Але ўсе зышліся на адным: так, кніга карысная, своечасовая, цікавая. Даніііл Аляксандравіч Гранін, які выступіў у заключэнне, падзякаваў удзельнікам дыспута за дзелавую крытычную ацэнку яго твора, за вялікую ўвагу да яго рамана.

## Справы паляпшаюцца

Хутка і непрыкметна ляціць час у студэнтаў. Не паспеў апамятацца, раскачацца пасля зімовай сесіі, глядзіш, а на носе ўжо і летнія экзамены. Студэнты пачынаюць рыхтавацца да гарачых дзянькоў.

Першакурснікі юрыдычнага факультэта ведаюць, што да кожнага семінара, да кожных практычных заняткаў трэба рыхтавацца добра, не абы як. «Хто добра рыхтуецца цяпер, таму перад сесіяй дастаткова паўтарыць, і ўсё пройдзенае адразу ўсплыве ў памяці», — наперабой скажуць вам першакурснікі, калі вы спытаеце ў іх аб значэнні падрыхтоўкі да семінараў.

Зімовую сесію яны вытрымалі, праўда, не надта добра. З 50 чалавек толькі тры выдатнікі, астатнія ходзяць у сярэдняках.

Гэта гаворыць аб тым, што слаба рыхтаваліся да практычных заняткаў, да сесіі, што камсамольская арганізацыя курса мала ўвагі ўдзяляла вучобе. Адны спасылаюцца на тое, што гэта была першая сесія, не было вопыту, не ведалі, як правільна рыхтавацца. Але справа не ў гэтым. Камсорг Віктар Кавалёў абыякава расказваў, што нсразумелыя пытанні «рыхтавалі» ўсёй групай, астатнія — паасобку. Аднак студэнты адмаўляюць гэта.

— Хто як мог, так і рыхтаваўся, — гавораць яны.

Віктар лічыць поспех трох выдатнікаў нармальным. Не, гэта не нармальна, гэта нават не поспех групы.

У другім семестры, трэба аддаць справядлівасць, група пачала звяртаць належную ўвагу на вучобу, падрыхтоўку да заняткаў. Быў праведзены групавы сход, на якім абмяркоўваліся вынікі зімовай сесіі і задачы на другі семестр. Ліквідавалі акадэмічную запазычанасць Кайдалёнак і Карніловіч, якія своечасова не здолелі здаць сесію. Яны паабяцалі, што ў далейшым будуць вучыцца лепш.

Цяпер справы на першым курсе ідуць на папраўку. На семінарскіх занятках студэнты, як гавораць, запалены агнём цікавасці, прагай пазнання невядомага.

І. КАПЫЛОВІЧ



На здымку: студэнт-практыкант 4 курса матфака **Іван Рыбалтоўскі** праводзіць практычныя заняткі па матэматычнаму аналізу на 2 курсе. Ля дошкі адказвае другакурсніца **Ала Бітно**.

Фота студэнта 2 курса матфака **І. Трухана.**

# Учарашні і сённяшні дзень Кубы

У гэтым артыкуле я хачу расказаць аб кубінскім народзе, яго жыцці, культуры, традыцыях і г. д. Я хачу расказаць аб гіганцкіх кроках нашага гераічнага народа, які толькі нядаўна вырваўся са страшэнных лап тыраніі:

Каб уявіць сабе веліч цяперашняй Кубы, трэба азірнуцца назад, успомніць нядаўняе мінулае народа, які больш паўстагоддзя быў пад прыгнётам амерыканскага імперыялізма. Не забыць ніколі здзекаванняў над нашымі самымі дарагімі ідэаламі.

Наш народ узняўся на барацьбу супраць тыраніі Батысты і перамог. Сёння гераічная Куба служыць маяком для краін Лацінскай Амерыкі ў іх барацьбе за сацыялізм, супраць эксплуатацыі чалавека чалавекам.

Жыццё на Кубе ў тыя часы было невыносным. Сотні тысяч дзяцей штогод паміралі ад розных захворванняў, таму што іх бацькі не мелі сродкаў на лякарствы. Адсутнасць школ, бальніц, ВНУ, усяго неабходнага для таго, каб чалавек жыў сапраўдным жыццём. Усё гэта было звычайным у краіне да рэвалюцыі. Рабочыя і сяляне не мелі пастаяннай работы. Працавалі толькі тры месяцы ў год. Гэта было тады, калі надыходзіў сезон уборкі цукровага трыснягу і яго перапрацоўкі.

Праходзілі гэтыя тры месяцы, і надыходзіў так званы «мёртвы час». Людзі жадалі працаваць, каб забяспечыць свае сем'і усім неабходным для жыцця. Але яны былі вымушаны сядзець дома, склаўшы рукі, і глядзець, як паўгалодныя, паўраспранутыя дзеці з кожным днём слабеюць, захворваюць і паміраюць.

Той, хто меў нейкую магчымасць сеяць што-небудзь на маленькім участку зямлі, рана ці позна павінен быў прадаць свой ураджай за нізкую цану, бо патрэбны былі вялікія грошы на лячэнне дзяцей і на лякарствы.

Сялян пастаянна эксплуатавалі памешчыкі. Сяляне жылі ў струхнелых хацінах, у беднасці і нястачы. Дзеці сялян раслі непісьменнымі. Яны нават марыць не маглі аб тым, што прыдзе дзень, калі яны змогуць паехаць у горад вучыцца, каб атрымаць спецыяльнасць інжынера, тэхніка ці інш.

У гарадах адбывалася тое ж. Было шмат беспрацоўных, не хапала школ, бальніц, дзіцячых устаноў.

Нарэшце, адбылася доўгачаканая рэвалюцыя, якая звергла тыранію Батысты і прынесла свабоду. Гэтая свабода каштавала нашаму народу дзесяткі тысяч маладых сэрцаў.

Рэвалюцыя ў працэсе свайго развіцця стварала і стварае ўсе эканамічныя, сацыяльныя і культурныя прадпасылкі, якія неабходны для эканамічнага і палітычнага развіцця краіны. Будуюцца новыя фабрыкі і заводы, адкрываюцца новыя школы, вышэйшыя навучальныя ўстановы, зямля аддадзена сялянам. Усе гэтыя пераўтварэнні адпавядаюць рэвалюцыйным законам нашай дэмакратычнай, сацыялістычнай дзяржавы.

Рэвалюцыя выпрацавала новыя вучэбныя планы, згодна якіх усе куткі нашага вострава асветлены ведамі. Прыкладам таму з'яуляецца тое, што мы за адзін год ліквідавалі непісьменнасць. Так было выканана слова, якое даў Фідэль Кастра на XV сесіі Генеральнай Асамблеі ААН. Цяпер наша моладзь мае магчымасць павышаць свае навукова-тэхнічныя веды. Школы цяпер належаць народу.

У наш баявы час рабочыя і сяляне, студэнты і школьнікі, мужчыны і жанчыны, дзеячы навукі і мастацтва аддаюць усе сілы пабудове сацыялістычнага грамадства. Гаворачы аб нашых паэтах, можна сказаць, што яны душою і целам аддадзены справе рэвалюцыі. У сваіх вершах, паэмах яны адлюстроўваюць тую вялікую работу, якую выконвае гераічны кубінскі народ. Сярод лепшых паэтаў — Індзіо Набары, Навара Луна, Ніколас Гільен і іншыя. Сярод іх выдзяляецца Ніколас Гільен, які яшчэ з маладых год уступіў у камуністычную партыю. Ён аддае ўсю сваю паэтычную сілу рэвалюцыі, народу.

Наш урад стварае ўсе умовы для народа: пабудаваны і будуюцца шмат новых дамоў для рабочых і сялян. У распараджэнні простых працаўнікоў —дамы адпачынку, турысцкія гарадкі, пляжы. Раней туды бедны чалавек не меў доступу, таму што ўсё гэта было ўласнасцю капіталістаў.

Моладзь стварыла свае масавыя арганізацыі, у якія ўваходзяць передавыя юнакі і дзяўчаты. У гэтых арганізацыях яны вывучаюць асновы марксізма-ленінізма. Гэта раскрывае перад моладдзю новы свет, бо раней антыкамуністычная прапаганда цягнула моладзь назад, рабіла адмоўны ўплыў на думкі маладых людзей.

Раней моладзь ніколі не магла нават падумаць, што можна прыехаць у Савецкі Саюз вучыцца, атрымаць спецыяльнасць, патрэбную для народнай гаспадаркі краіны. Цяпер мы ведаем, што значыць жыць пры сацыялізме, бо наша Радзіма ідзе па шляху яго развіцця: рабочыя сталі гаспадарамі сваіх прадпрыемстваў, сяляне — гаспадарамі сваіх зямель, жанчына мае роўныя правы з мужчынай, дзеці маюць усё неабходнае для шчаслівага дзяцінства, старыя маюць права на забяспечаную старасць. Мы бачым усе перавагі сацыялістычнага грамадства.

Ужо цяпер, калі будуецца сацыялізм, калі кубінскі народ жыве новым жыццём, на вуліцах не ўбачыш дзяцей-жабракоў, не ўбачыш галодных рабочых і сялян, таму што ўсе маюць пастаянную работу.

Моладзь атрымала магчымасць вучыцца, таму мы знаходзімся цяпер тут, у Савецкім Саюзе. Наш урад прапанаваў нам паехаць у СССР, каб мы сталі выдатнымі спецыялістамі. Нам яшчэ цяжка вывучаць рускую мову, цяжка яшчэ і таму, што мы далёка ад Радзімы, ад сям'і. Мы часта ўспамінаем наш маленькі востраў свабоды, які ўвесь час знаходзіцца пад пагрозай імперыялістаў. Але мы заўсёды адчуваем побач моцнае плячо нашых савецкіх сяброў, усяго народа краіны сацыялізма.

Мануэль дэ ля ГУАРДЗІЯ,

студэнт падрыхтоўчага факультэта БДУ.

# Стихи Юрия Сапожкова



*Юрию Сапожкову — 23 года. На отделение журналистики БГУ он поступил в прошлом году после службы в армии. Первое стихотворение «Деду» было написано им в 15 лет. Свои стихи Юрий печатал в «Калининградском комсомольце», «Калининградской правде»; теперь выступает на страницах «Знамени юности», является членом литобъединения при этой газете. Сейчас несколько стихов Юрия сданы в коллективный сборник, который выйдет в Калининградском областном издательстве.*

*Стихам Юрия Сапожкова присущи лаконичность, законченность, объемность образов. Он самобытен в решении поэтических тем.*

* * *

Ты говорил, что жить чертовски трудно,
И оттого тебе еще больней,
Что люди здесь холодные, как тундра,
И даже тундры этой холодней.
Ты всех бранил, ты всех хулил на свете.
Ты с жаром потрясал рукой...
И ты был прав: я по себе заметил,
Что людям холодно с тобой.

## Принимали в партию солдата

Принимали в партию солдата...
И легко ложились в протокол
Биографии короткой даты:
Год рожденья, школа, комсомол
Рядовой по званью и заслугам,
Неизвестный никому пока,
Был знаком он с трактором и плугом—
Стал танкистом нашего полка.
Мать его — сейчас хозяйка в доме,
А отца... не помнит и лица...
Он пришел к секретарю парткома
По следам погибшего отца.
И недаром после выступлений
Председатель не считал кто «за».
И с портрета сам товарищ Ленин
Щурил потеплевшие глаза.

* * *

А до новых стихов погоди...
Пусть они еще зреют в груди.
Видно, им еще рано на свет.
Видно я — никакой не поэт.
Просто я, как мальчишка, влюблён
В солнце, в песни, волос твоих лён
Ты до новых стихов погоди —
Ведь у нас еще все впереди.

Куток сатыры і гумару

## Без вады...

*Хто не ведае песні вадавоза з фільма «Волга—Волга»?! Ведаюць яе і студэнты нашага універсітэта, якія жывуць у інтэрнаце № 2. Толькі да апошняга часу яны не надавалі асаблівага значэння зместу песні, у прыватнасці, словам: «Нават муха без вады — і не туды, і ні сюды». Ацаніць сэнс гэтых слоў студэнтам дапамаглі гаспадарнікі універсітэта. Справа ў тым, што вось ужо каторы дзень на верхнія паверхі інтэрната не падаецца вада. Таму кожную раніцу студэнты бягуць уніз, ствараюць чэргі, каб памыцца.*

*Студэнты — народ дасціпны. У момант адрэдагавалі песню. «І студэнту без вады — і ні туды, і ні сюды», — так пяюць яны цяпер, хоць без вады не асабліва і паспяваеш. Ходзяць чуткі, што студэнты збіраюцца хорам праспяваць гэтую песню гаспадарнікам універсітэта і ва ўзнагароду за яе атрымаць падарунак: ваду, час, які яны яны губляюць у чэргах, і ўвагу да сваіх элементарных патрэб.*

## ...і з вадой

*Красавіцкае сонца прыгрэла пасапраўднаму. Дахі млява пацягваюцца, грэюць свае лысіны. Аж пот з іх капае. З раніцы капаюць на зямлю толькі кропелькі, а ўдзень і зацурчыць. Вады столькі ля інтэрната № 1 збіраецца, што толькі ў лодцы пераедзеш. Асабліва калі прыцямнее. Мора плешчацца пад вокнамі, падмывае сцены.*

*Раптам нехта плюхаецца ў «мора». Вада булькае, пацяшаецца над сваёю ахвярай. Ветрык вясенні аж заходзіцца ад смеху. Вось пабудаваць бы каля інтэрната флот. Ну і ганяў бы вецер лодкі, надуваў бы ветразі! Двор вялікі. Прастора! Шырыня!*

*Скажу па сакрэту: нехта прадставіў ужо свой праект асваення новага вадаёму. Будзеце-там, дапамажыце хутчэй ажыццявіць яго. Бо прыдуць гаспадарнікі — трэба каб яны ног не замачылі.*

*Даніла ШЫЛА.*

# АЛЬБАТРОСЫ ТРЫМАЮЦЬ АБАРОНУ

Вайна гэта ужо шмат гадоў працягваецца, а калі скончыцца, невядома.

Месца ваенных дзеянняў — атол Мідуэй, які знаходзіцца на паўночным захадзе ад Гавайскіх астравоў. Ваюючыя бакі: лётчыкі амерыканскіх ВПС і... альбатросы.

...На невялікім астраўку, шырыня якога ледзь болей 1,5, а даўжыня каля 3 кіламетраў, гнездзяцца па меншай меры 25 тысяч альбатросаў, і самалёты пры пасадцы часта сутыкаюцца з імі. Улічыце: важыць альбатрос каля 10 кілаграмаў, размах крылаў у яго прыкладна два метры. У лепшым выпадку на фюзеляжы або крылах самалёта застаецца ўмяціна. Аднак нярэдка сутыкненні канчаюцца і больш трагічна.

І вось што цікава. Альбатросы не адчуваюць ніякага страху перад чалавекам. Больш таго, па меры забудовы тэрыторыі птушкі, якія раней гнездзіліся толькі на беразе, сталі перасяляцца і ўладкоўвацца на крышах дамоў, на клумбах і газонах, у ангарах, у маскіровачных навесах зенітных батарэй.

Зразумела, самым простым было б убраць ваенную базу. Але амерыканскіх генералаў такое рашэнне не задавальняла.

Амерыканцы ўстанавілі на востраве шмат пужайлаў—на альбатросаў гэта не падзейнічала. Спрабавалі паліць старыя аўтамабільныя пакрышкі — не дапамагло. Спрабавалі адганяць птушак сігнальнымі ракетамі і дымавымі шашкамі — безвынікова. Расстанавілі дынамікі, якія выдавалі свісты і хрыпы... і даставілі, відавочна, радасць птушкам: тыя ўступалі ў суперніцтва з тэхнікай і заглушалі яе сваімі крыкамі. Хтосьці прапанаваў расстрэльваць птушак шрапнеллю, але і тут нічога не выйшла: прыцягнутыя гарматнымі выстраламі, да Мідуэя зляталіся тысячы альбатросаў з суседніх астравоў. Колькасць птушак яшчэ больш павялічылася!

У рэшце рэшт камандаванне авіябазы рашылася на такія меры: арганізавала атрады па знішчэнню альбатросаў. Але колькі ні знішчалі, менш птушак на востраве не станавілася — апусцеўшыя гнёзды займалі альбатросы, прыляцеўшыя з мора... Атрады «паляўнічых» прыйшлося распусціць.

Цяпер на востраве знаходзіцца вялікая група біёлагаў і арнітолагаў. Яны вывучаюць прывычкі і норавы альбатросаў у надзеі знайсці які-небудзь эфектыўны спосаб выжыць іх з Мідуэя.

А пакуль самалёты па-ранейшаму сутыкаюцца ў паветры з птушкамі, лётчыкі жывуць у пастаянным страху.

(З часопіса «Знание — сила» № 3 за 1963 г.).

## ВЫ НЕ ЗАБЫЛІ АРЫФМЕТЫКУ?

Кожная літара тут азначае лічбу. Аднолькавыя літары азначаюць аднолькавыя лічбы. Трэба адшукаць такія лічбы замест літар, каб усе арыфметычныя дзеянні па гарызанталях і вертыкалях далі правільны вынік.

abc — dec = egh
:   +   —
c × dk = dda
bd + dgg = nec

## САМАЯ ШЧАСЛІВАЯ ПАРА

**Усе рэкорды шчаслівага сямейнага жыцця пабілі венгр Янаш Равен і яго жонка Сара. Яны памёрлі амаль у адзін і той жа дзень у 1825 годзе. Янаш — ва ўзросце 172 гады, Сара — у 164 гады, пражыўшы разам 147 гадоў.**

Рэдактар У. КУЛАЖАНКА

Адрас рэдакцыі:
Мінск Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19.

Друкарня Белсаўпрофа.
АТ 04254. Тыр. 2000. Зак. 1308.